Дзяржаўная ўстанова дадатковай адукацыі
”Аршанскі  раённы цэнтр фізічнай культуры, турызму і краязнаўства дзяцей і моладзі“

**АДКРЫТЫ ЗАНЯТАК**

# Гульнёвая праграма ”З хатняга куфэрка“



Раманькова Ірына Міхайлаўна, педагог дадатковай адукацыі, вышэйшая кваліфікацыйнай катэгорыі

17.01.2023

**Назва:** Гульнёвая праграма ”З хатняга куфэрка“
**Дата правядзення:** 17.01.2023
**Мэта:** даследаванне звычаяў малой радзімы, адраджэнне і перайманне сямейных традыцый, умацаванне сувязі пакаленняў праз даследаванне этнаграфіі роднага краю, папулярызацыю нацыянальнай культуры.
**Удзельнікі:** Навучэнцы 1 году навучення, гуртка “Музеязнаўцы”, 14-17 гадоу і педагагічны калектыў.

**План гульні**

1. Уступнае слова. Прывітанне Гаспадара і Гаспадыні;
2. Знаёмства Гаспадара з прадметамі ў ”Дзедавым куце“;
3. Знаёмства Гаспадыні з прадметамі ў ”Бабіным куце“;
4. Майстар-клас ”Прыгатуем хлеб“,”Пасціраем і пагладзім бялізну“;
5. Знаёмства Гаспадара з прадметамі хатняга быту;
6. Інтэр’актыў ”Макет сялянскай хаты“;
7. Інтэр’актыў ”Адзенне беларусаў“.

Далей другая група выхаванцаў праводзіць гульнёва-пазнаваўчую праграму таксама па плану:

**План гульнёва-пазнаваўчай праграмы**

1. Уступнае слова.
2. Конкурс ”Хто самы ўважлівы“.
3. Конкурс ”Пазнай прадмет па апісанню“.
4. Конкурс ”На кірмаш“.
5. Конкурс ”Адгадай загадкі“.
6. Конкурс ”Дзяды і ўнукі“.
7. Конкурс ”Працягні прыказку“.
8. Падвядзенне вынікаў падарожжа. Узнагароджванне пераможцаў.

Такім чынам, дзеці,у рамках дадзенага этнаграфічнага падарожжа, знаёмяцца зэтнаграфічнымі прадметамі, іх прызначэннем, выступаюць ў ролі экскурсаводаў, распрацоўваюць заданні да гульнёвай праграмы.





**Ход**

**Вядучы:** Сёння разам з вамі мы здзейснім невялікае падарожжа. А будзе яно незвычайнае. Мы паспрабуем вярнуцца ў мінулае і пабываць у гасцях ў сялянскай хаце, паглядзець, як жылі нашы продкі, як выглядала іх хата. Згодны? Тады заплюшчым вочы. Палічым: раз, два, тры! І зробім тры крокі наперад. *(Дзеці праходзяць ў"сялянскую хату")*

Вось мы і апынуліся ў сялянскай хаце. Як тут прыгожа! Колькі тут цікавых рэчаў! Але ж дзе нашы гаспадары?

*Выходзяць Гаспадар і Гаспадыня.*

**Гаспадар:** Добры дзень, шаноўныя госці! Рады бачыць вас у нашай хаце. Я – Гаспадар. Я – галоўны ў сям'і. Сям'я ў мяне вялікая і працую я шмат. Прылад для працы ў мяне хапае. Давайце іх разгледзім.

1. Адкажыце, мужчыны, што стаіць ля ўваходу? (*Саха*) Я ару ёй поле.
2. Вось тут на сцяне музычны інструмент. Што гэта? (*Шархуны)* Для чаго яны? *(Мацавалі на каня на святы).* Можна нават пазвінець.
3. А вось гэта рэч для чаго? *(Цэп, аббіваць зерне са снапоў)*
4. А як называецца месца, куды гаспадар звозіў снапы з поля? *(Гумно*)



5. Гэту рэч я зрабіў для сваёй гаспадыні. Як вы думаеце, што яна будзе з ёй рабіць? (*Гэта рагач. Гаспадыня вешае на яго гарлачы)*
6. Адгадайце маю загадку:

Два парсючкі, а чатыры хвасцікі. Што гэта? *(Лапці і аборы).*

Мяне бацька з шасці гадоў вучыў іх плесці. Вось іх колькі. Для гэтага мне трэба лыка. З лыка я і кашы пляту.

7. Чым раней сяляне накрывалі дах? *(Саломай).* Гэтай прыладай салому раўнялі.

8. А для чаго мне гэта рэч? *(Скрабок. Здзіраць кару з дрэва на будоўлі).*





9. А гэта бязмен. Для чаго ён? *(Каб узвешваць што-небудзь*). А ў чым раней мерылі вагу? (*У пудах).*

10. А што гэта ўнізе розных памераў? (*Калодкі, каб шыць абутак).* Гэта для дзяцей, а гэта для дарослых.



*А далей Бабін кут. Тут мне дапаможа мая гаспадыня.*

**Гаспадыня:** Я таксама цэлы дзень працую. Кручуся ля печы. Прылад у мяне розных хапае. Давайце паглядзім.

1. Што гэта такое? (*Серп).* Што ім робяць? *(Жыта жнуць).* Вельмі цяжкая праца.

2. Што стаіць на печы? (М*аслабойка)*

3. Навошта я паставіла яе на печ? (*Цёплым масла лягчэй б'ецца*)

4. А чаму тут стаіць прас? (*Грэецца ад вуглей)*

5. Як называецца вось гэты прадмет? Правільна, качарга. Пра яе так гаварылі: ”Качарга – у печы гаспадыня“. Сапраўды, цяжка сабе ўявіць, як можна было выпаліць печ без качаргі..

6. А гэта для чаго? (*Хлебная лапата каб саджаць хлеб у печ)*

Я печ добра натапіла і якраз збіралася хлеб садзіць. Дапамажыце мне.

1. Спачатку дно печы падмятаем памялом.

*2.* А навошта я тут столькі лістоў кляновых назбірала. *(Пад хлеб класці, каб чысты быў)*

А хто з дзяўчат мне дапаможа?*(Гаспадыня садзіць хлеб у печ).*

3. Давайце разгледзім іншыя прылады, якімі я карыстаюся. Што гэта такое вялікае? *(Ступа)*

4. Тут кашы і начоўкі, буду ў іх мыць адзенне.Гарлачы патрэбны для малака і для квасу.

5. Далей рэчы для прадзення. Гэта праснiца, кудзелю прасцi.

6. А гэта што? (*Пралка)*

7. А гэта рэч з казкі. Што гэта? (*Верацяно)*

8. А гэта што такое? *(Качалка*) Што ёй рабілі? (*Прасавалі адзенне*)

Давайце паспрабуем гэта зрабiць.

А ў гэтым куфары быў мой пасаг. Я яго з 12 гадоў гатавала. Шыла, ткала, вышывала. Поўны куфар нарабiла. Не сорамна было да жанiха везцi. Давайце паглядзiм, што ляжыць у iм ( дастае па чарзе ручнiк, карункi, кашулю, абрус, падзор i г.д.).

Як вы думаеце, якая рэч прыйшла на змену куфру? (Шафа)



**Гаспадар:**

1. Я зрабiў гэту рэч. Як яна называецца? (Пранiк). Для чаго яна? (Мыць бялiзну).Пакажыце, як будзем гэта рабiць.

2. Гэта дзiцячая люлька. Я яе рабiў сам. Усе мае дзецi ў ёй раслi, каб дружныя былi.Над ёй мацi заўсёды спявала свайму дзiцяцi калыханкi. Давайце паглядзiм, цi ёсць ў ёй хто? (Дзецi знаходзяць там ляльку). А цi можаце вы ўзгадаць калыханкi, якiя спявалi вам матулi?



3. А гэтаму ложку больш чым сто год. Яго рабiў яшчэ мой дзед.

А прыбiрала яго Гаспадыня, старалася.

Гэта макет сялянскай хаты. Там усё строга на сваiх месцах.

1. Гэта самае пачэснае месца ў хаце.Раней яго нашы продкi называлi покуць, або Чырвоны кут. На покуцi ў хаце заўсёды вiселi абразы, убраныя вышытымi ручнiкамi. Над сталом вiсеў саламяны павук. Лiчылi, што такi павук прыносiць шчасце.

2. Як называлiся ручнiкi, каторымi пакрывалi iконы? (Набожнiк)

3. У куце быў абярэг. Як ён называўся? Пакажыце яго. (Павук)
4. Пакажыце Бабін кут.
5. Што такое гушкалка? (Люлька). Пакажыце.
6. Дзе захоўваўся пасаг дзяўчыны? (Куфар)

Тут вы бачыце адзенне беларусаў.

1. Мужчыны насілі вышытыя кашулі з ільну і нагавііцы. Што такое нагавіцы?




2. Летам насілі саламяны брыль.
3. Жанчыны насілі сарочкі, спадніцы, паверх адзявалі фартух, бязрукаўку.
4. Скажыце, гэта дзяўчына замужам ці не? Незамужнія маглі распускаць валасы, насіць ленты. Замужнія жанчыны завязвалі на галаву намітку ці хустку.
5. На гэтай лялькі мы бачым, як раней хадзілі нашы аршанкі. Аршанскі касцюм адносіцца да дубровенскага строю.

А зараз мы праверым, як уважліва вы слухалі нас з гаспадыняй.

### 1. Конкурсна-гульнёвая праграма



- Дом – самая важная частка матэрыяльнай культуры народа. Назавіце самае ганаровае месца ў хаце. Як яно называлася?*(Чырвоны кут)*

- Як называліся рушнікі, каторымі пакрывалі іконы?*(Набожнікі)*

- Якія колеры былі на рушніках Аршаншчыны?*(Белы, чырвоны, чорны)*.

- У якія моманты жыцця селяніна выкарыстоўваліся рушнікі?*(Радзіны, вяселле, пахаванне, упрыгожванне,абярэгі)*.

- Як называецца саламяны абярэг ў доме? *(Павук)*

- Як называлася рабочае месца гаспадара дома? *(Дзедаў кут)*

- Як называлася месца ў доме, дзе ўвесь час завіхалася гаспадыня дома? *(Бабін кут)*

- Дзе яно знаходзілася? *(Ля печы)*

ОРЦФТиКДиМ

- Дзе па паверьях жыў у доме дамавік? *(Ля печы, пад венікам)*

- Назавіце асноўную частку як мужчынскага, так і жаночага касцюму. Яе насілі ў любым узросце,у будніі святы, пры любым сямейным становішчы. *(Кашуля)*

- Назавіце важны элемент мужчынскага і жаночага касцюмаў. Выходзіць без яго на людзі было не прынята. Таксама, лічыўся абярэгам. *(Пояс)*

- Як называўся галаўны ўбор замужніх жанчын? *(Намітка)*

- Што такое нагавіцы?*(штаны).*

- Чаму ў люльцы ляжаць цацкі? *(Нельга, каб люлька была пустая, паселяцца нячысцікі і будуць трывожыць сон дзіця.)*

## 2. Конкурс ”Пазнай прадмет па апісанню“

| |
|---|
| Найпрацейшая драўляная прылада для малацьбы збожжа |
| Прыстасаванне насіць сена, салому. |
| Прылада для размешвання чаго-небудзь |
| Прадмет хатняга абіходу, рабіўся з конскага воласу ці дроту, нацягнутага на абруч. У якасці падказкі загадка “Новая пасудзіна, а ўся ў дзірках” |
| Прадаўгаватая пасудзіна з адкрытым верхам. |
| Бандарны выраб, традыцыйная прылада для апрацоўкі зерня на крупы. |
| Тоўстая драўляная палка, прамая ці выгнутая, з падвешанымі кручкамі або з выемкамі на канцах для пераносу на плячах вёдзер з вадой і інш. грузаў. |
| Рабілі яе з дошак і драўляных рэечак. Падвешвалі на чатырох почапках да столі ці да жэрдкі, якая адным канцом мацавалася да бэлькі. |
| Узорыстатканы выраб. Ёй засцілаюць ложак, ёю накрываюцца, яе вешаюць на сцяну для ўпрыгожвання інтэр’ера сялянскай хаты. |

## 3. Конкурс ”На кірмаш“

Кожны выцягвае аркуш. На якім напісана, што ён павінен набыць. Расходзяцца па зале, шукаюць прадмет.

| | | |
|---|---|---|
| **Шархуны** | **Кораб** | **Гэблік** |
| **Падзор** | **Накідка** | **Рэзгіны** |
| **Калатоўка** | **Матавіла** | **Верацяно** |
| **Дзежка** | **Кудзеля** | **Грэбень** |
| **Бойка** | **Лыка** | **Калодкі** |

**4. Конкурс ”Адгадай загадкі“**

1. Пад адной страхой чатыры браты стаяць. *(Стол)*

2. Усім, хто ўваходзіць, усім, хто выходзіць руку падае. *(Ручка ў дзвярах)*

3. Хрэсь-перахрэсь, ва ўсіх у доме ёсць. *(Вокны)*

4. Зімой есць, а летам спіць. Цела тёплае, а крыві няма. Сесці на яе сядзеш, а з месца не звязе. *(Печ)*

5. Бімлі мяне, калацілі мяне, а за стол з царом пасадзілі. *(Абрус)*

6. Не разяначка я – мяне ж усе смакуюць, не дзяўчыначка я – мяне ж усе цалуюць. *(Лыжка)*

7. Сінявокі, слаўны, чысты, галавасты, залацісты. Дасць абноў ён людзям шмат, будзе кожны вельмі рад. *(Лён)*

8. Быў на пажары, быў на базары, малады быў – усіх карміў, як стары стаў – пеленацца стаў, давялося паміраць – некаму касцей пахаваць. *(Гаршок)*

9. Сеў на вазок і паехаў на аганёк. *(Вілы і чыгун)*

10. Я з ножкамі, а не хаджу, са спіною, а не ляжу, сядайце вы – я не сяджу. *(Крэсла)*

11. На страсе сядзіць і люльку курыць. *(Комін і дым)*

12. Маці – таўстуля, дачка – красуля, а сын перабор паляцеў на двор. *(Печ, полямя, дым)*.

13. Стаіць сасна, на сасне лён, на льне жыта. *(Стол, абрус, хлеб)*

ОРЦФКТИКДИМ

**5. Конкурс ”Дзяды і ўнукі“**

Паказваюцца малюнкі, трэба знайсці адпаведніка ў мінулым.

1. Міксер (калатоўка)
2. Прас (качалка)
3. Вагі (бязмен)
4. Газавая пліта (кірагаз) Вазок (гушкалка)
5. Мелькамбінат (жорны)
6. Сноуборд (каза)
7. Шафа (куфар)
8. Пральная машына (пранік)

Пакажыце, як гэта працавала ў мінулым.

**6. Конкурс ”Працягні прыказку“**

Якая Агатка, такая ў яе і хатка
Слаўная хата не кутамі, але пірагамі.
Няма лепшай хаткі, як у роднай маткі
Свая хатка – родная матка, а чужая - мачыха
Добра на Доне, ды лепей у сваім доме

***Падвядзенне вынікаў. Узнагароджванне пераможцаў.***

# Літаратура і інфармацыйныя рэсурсы

1. Беларускае народнае жыллё. Мн., 1973.
2. Габрусь Т.В. Архитектурное проектирование в Белоруссии. У истоков // Строительство и архитектура Белоруссии. 1990. № 4.
3. Кацер М. С. Белорусская архитектура.— Мн., 1956.
4. Локотко А.И. Белорусское народное зодчество. Мн., 1991.
5. Молчанова Л. А. Материальная культура белорусов.— Мн.,1968.
6. Сергачев С.А. Белорусское народное зодчество. Мн., 1992.
7. Соколовский В.Э., Алимов Р.Н., Осипов С.И. Сельский индивидуальный жилой дом. Мн., 1990.
8. Трацевский В.В. История архитектуры народного жилища Белоруссии. Мн., 1989.
9. Школьник А.Е. Печное отопление малоэтажных зданий. М., 1991.

Ссылки на интернет-источники:

[community.livejournal.com/gorodok1863/7340.html
Белорусская деревня: быт, хозяйство и традиционная культура]

[vln.by/book-village/index.html В. Носевич. Традиционная белорусская деревня в европейской перспективе]

[bibliotekar.ru/spravochnik-23/1.htm Народные традиционно-исторические типы усадебной застройки]

[www.russiancity.ru/hbooks/h050.htm А. И. Локотко Типы традиционной застройки крестьянского двора в Белоруссии (XIX — середина XX в.)]

[varandej.livejournal.com/342925.html Строчица. Музей народной архитектуры]

ОРЦФТИКДиМ